# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ – РОДНАЯ МОВА

***III Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце», якая праходзіла ў межах святкавання Фестывалю беларускага слова, сабрала ў канферэнц-зале нашага ўніверсітэта студэнтаў і выкладчыкаў ВДУ імя П.М. Машэрава, а таксама вядомых навукоўцаў Беларусі.***

На пленарным пасяджэнні з уступным словам выступіў дэкан філалагічнага факультэта, доктар педагагічных навук С.У. Нікалаенка.

Пра месца беларускай мовы ў сучаснай камунікатыўнай прасторы нашай краіны расказаў вядомы беларускі вучоны-мовазнаўца, першы намеснік дырэктара па навукавай рабоце ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар, доктар філалагічных навук, акадэмік НАН Беларусі А.А. Лукашанец.

– Сёння беларуская мова знаходзіцца ў няпростым становішчы. Разам з тым яна з'яўляецца адной з найбольш высокаразвітых і пашыраных літаратурных моў свету, дзяржаўнай мовай нашай краіны і можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства. У гэтым накірунку робяцца хоць і невялікія, але паслядоўныя крокі. Паступова ўжыванне беларускай мовы пашыраецца ў тых сферах, дзе яна павінна выкарыстоўвацца як дзяржаўная, – адзначыў Аляксандр Аляксандравіч.

На канферэнцыі выступіла загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы НАН Беларусі, доктар філалагічных навук В.П. Русак, якая расказала пра месца беларускай мовы і асноўныя моўныя з'явы, якія вылучаюць яе сярод іншых славянскіх моў. Валянціна Паўлаўна падкрэсліла важнасць правядзення дадзенага мерапрыемства, якое сабрала ў ВДУ імя П.М. Машэрава аднадумцаў з усёй краіны.





Пасля пленарнага пасяджэння аспіранты, магістранты і выкладчыкі нашага ўніверсітэта пабывалі на цікавай сустрэчы з акадэмікам НАН Беларусі А.А. Лукашанцам. Затым удзельнікі канферэнцыі прынялі ўдзел у рабоце пяці секцый, дзе разглядаліся і абмяркоўваліся навуковыя даследаванні, падзеленыя па праблематыцы.

– Сённяшняе мерапрыемства з'яўляецца своеасаблівым падрахункам працы над навуковымі тэмамі выкладчыкаў кафедры беларускага мовазнаўства і кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава. Таксама канферэнцыя дае магчымасць пазнаёміцца з працамі даследчыкаў іншых кафедраў універсітэтаў і навукова-даследчых цэнтраў нашай краіны, абмяняцца вопытам і выказаць меркаванні па розных актуальных пытаннях беларусістыкі, – адзначыў загадчык кафедры беларускага мовазнаўства, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Генадзь Антонавіч Арцямёнак.

**Вікторыя ЧАКУШКА.**
**Фота аўтара.**